Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 30 мая 2000 года, аўторак, № 9 (1821)

НАШ ВЫБАР

# КРОКІ Ў XXI СТАГОДДЗЕ

*25 мая адбылася, па сутнасці, гістарычная падзея. На пасяджэнні Аб'яднанага савета БДУ прайшлі першыя ў гісторыі універсітэта выбары рэктара.*

Само жыццё вызначыла так, што не аказалася дастойнага апанента цяперашняму кіраўніку Белдзяржуніверсітэта Аляксандру Уладзіслававічу Казуліну. Гэта яскравы паказчык таго, што вялікай большасцю членаў універсітэцкага калектыву падтрымліваецца тая палітыка, якая вядзецца тут апошнія гады пад кіраўніцтвам рэктара.

Значна палепшыліся ўмовы працы, удасканальваецца матэрыяльная база, адкрыты новыя факультэты і спецыяльнасці, павялічылася якасць выкладання дысцыплін, пашыраюцца міжнародныя сувязі, дабавілася шмат цікавых і карысных навуковых распрацовак, з'явіліся падставы для арганізацыі ўласнай вытворчасці. Але наперадзе яшчэ шмат задумак, планаў, спраў... Аб гэтым падрабязна распавядаў на пасяджэнні Аб'яднанага савета кіраўнік універсітэта.

Гэта выступленне можна разглядаць і як асабістую справаздачу А.У. Казуліна за гады працы рэктарам, і як праграму дзеянняў на перспектыву. Дарэчы, такой думкі прытрымліваецца і намеснік кіраўніка ўрада краіны Уладзімір Замяталін. У сваёй прамове ён ахарактарызаваў рэктара як чалавека, з якім вельмі цяжка працаваць, бо яго думкі рухаюцца намнога хутчэй, чым павялічваюцца магчымасці ўрада. Па словах У. Замяталіна, тое, што рэктар пайшоў на такі крок, як выбары, сведчыць аб яго чалавечай смеласці і ўпэўненасці ў правільнасці сваіх спраў, бо, калі разабрацца, мог бы і працягваць працаваць па прызначэнні дзяржаўнай улады.

Былы рэктар БДУ Фёдар Мікалаевіч Капуцкі выказаўся наконт таго, што універсітэт перажывае трэці вялікі ўздым у сваёй гісторыі. Першы пачаўся, калі ён быў арганізаваны ў 1921 годзе. Вялікая эпоха адраджэння наступіла ў шасцідзесятыя гады. Сёння Белдзяржуніверсітэт уздымаецца на якасна новую



ступень — выходзіць на высокі сусветны ўзровень.

У адрас Аляксандра Уладзіслававіча Казуліна было выказана нямала добрых слоў і іншымі выступаючымі, сярод якіх былі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Міхаіл Мясніковіч, Міністр фінансаў Мікалай Корбут. Увогуле атмасфера аднадушнасці панавала ў вялікай зале, дзе працаваў Аб'яднаны савет. Гэта пацвердзілі і наступныя падзеі. Як толькі сталі вядомы вынікі тайнага галасавання, людзі паўставалі з крэслаў і апладысментамі "зацвердзілі" пратакол падліковай камісіі. Для статыстыкі нагадаем, што з 505 бюлетэняў, якія аказаліся ў урнах, 484 былі "за".

— Я даўно не хваляваўся так, як сёння, — прызнаўся пасля А. Казулін, — у поўнай меры пачаў дзейнічаць Статут універсітэта, наша своеасаблівая канстытуцыя. Гэтыя выбары я павінен быў прайсці. Я ўпэўніўся, што калектыў мне давярае. А давер калектыву даражэй нават за давер дзяржавы. Без даверу няма крылаў, сёння гэтыя крылы з'явіліся.

Вялікі крэдыт даверу выдалі члены Аб'яднанага савета намесніку загадчыка кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі дацэнту Мікалаю Іванавічу Казлоўскаму, якога таксама тайным галасаваннем выбралі старшынёй Камісіі па этыцы. З 504 прагаласаваўшых 487 выказаліся "за".

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*



# КРОКІ Ў XXI СТАГОДДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Да таго ж, пасля пасяджэння Савета гэта камісія, калі можна так сказаць, стала ў поўнай меры правадзейнай. Усе яе члены, згодна з палажэннем, ва ўрачыстай абстаноўцы прынялі прысягу на вернасць сваёй справе.

Сакратаром Аб'яднанага савета адкрытым галасаваннем быў абраны дэкан гістарычнага факультэта дацэнт Алег Антонавіч Яноўскі.

Дарэчы, ён як старшыня камісіі па распрацоўцы геральдычнай сімволікі універсітэта прадставіў на суд Савета ўзоры сцяга і герба БДУ. У якасці сімвала Белдзяржуніверсітэта камісія прапанавала выяву ліста папаратніка на фоне свячэння яго таямнічай кветкі. Гэта, па словах А. Яноўскага, "павінна ўвасабляць беларускае паходжанне і глыбінную сутнасць дзейнасці БДУ".

Камісія таксама прапанавала сіні колер на гербе і сцягу як увасабленне ідэі універсітэта. Нібыта ў геральдыцы ён павінен адлюстроўваць вучонасць, навуку, а "пераходны колер ад сіняга да серабрыстага дае магчымасць падкрэсліць, наколькі цярністы шлях да ведаў — вучонасці, які цудоўны і светлы ён".

Прадстаўленыя ўзоры былі зацверджаны як аснова для далейшых распрацовак разнастайнай сімволікі.

*Максім НЯВІНСКІ.*
*Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА.*



*Ва ўрачыстых абставінах прысягу прымаюць члены Камісіі па этыцы.*

# КНІГА ПАМЯЦІ

Беларускім дзяржаўным універсітэтам выдана кніга сакратара Савета ветэранаў БДУ, дацэнта Альберта Іосіфавіча Котава "Белдзяржуніверсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945: Кніга памяці)".

На аснове архіўных і апублікаваных матэрыялаў, успамінаў ветэранаў расказваецца аб удзеле студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта ў абарончых і наступальных аперацыях Савецкай Арміі ў гады вайны, у падпольных арганізацыях і партызанскіх атрадах, а таксама на працоўным фронце. Азнаёміцца з кнігай можна ў бібліятэцы БДУ.

*Міхаіл СІМАНЮКОЎ.*

**НА ЗАМЕТКУ**

# *Этыка і канкрэтыка*

*Як вядома, 25 мая на пасяджэнні Аб'яднанага савета БДУ прынялі прысягу восем членаў Камісіі па этыцы. З гэтага моманту яны прынялі ўсю паўнату адказнасці за свае дзеянні ў рамках гэтай структуры. Хто ж гэтыя людзі, якім даверылі фарміраваць добры маральна-псіхалагічны клімат ва універсітэце?*

**Мікалай Іванавіч КАЗЛОЎСКІ.** Старшыня камісіі; кандыдат тэхнічных навук, дацэнт кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі механіка-матэматычнага факультэта.

**Алена Паўлаўна АНДРЭЕВА.** Загадчык кафедры грамадскіх дысцыплін, выкладчык вышэйшай катэгорыі ліцэя БДУ.

**Валянціна Мікалаеўна БІБІЛА.** Прафесар кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду юрыдычнага факультэта, доктар юрыдычных навук.

**Ларыса Міхайлаўна БАГДАНАВА.** Намеснік начальніка Упраўлення кадраў БДУ.

**Ігар Алегавіч ГРУНТОЎ.** Дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта, кандыдат юрыдычных навук.

Расціслаў Афанасьевіч ЖМОЙДЗЯК. Прафесар, загадчык кафедры геадэзіі і картаграфіі геаграфічнага факультэта, кандыдат геаграфічных навук.

**Віктар Васільевіч ЦІХАМІРАЎ.** Загадчык лабараторыі ядзернай оптыкі НДІ ЯП БДУ, доктар фізіка-матэматычных навук.

**Сяргей Мікалаевіч ЧАРАНКЕВІЧ.** Загадчык кафедры біяфізікі фізічнага факультэта БДУ, доктар біялагічных навук, прафесар.

# *Адгукніцеся, людзі!*

Саюз жанчын БДУ звяртаецца з просьбай да супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта аказаць Кахненцы Ірыне Аляксандраўне, метадысту РІВШ, матэрыяльную дапамогу для падтрымкі і лячэння цяжкага захворвання.

*Р/р ГА "Саюз жанчын Белдзяржуніверсітэта" УНН 101573590. Мінская Гарадская дырэкцыя ААГ "Белбізнесбанк". Код 764 №3015210450013. Для Кахненкі Ірыны Аляксандраўны.*

**ВІНШУЕМ!**

# *Гранты — не за гарамі*

У Беларускім дзяржаўным універсітэце скончыўся конкурс грантаў, які традыцыйна праводзіцца аддзелам навукова-даследчай работы студэнтаў і аспірантаў Упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Гранты накіроўваюцца на падтрымку навуковых даследаванняў творчых калектываў, якія складаюцца са студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. У конкурсе прымалі ўдзел 28 праектаў. Пераважная большасць праектаў — 23 — былі пададзены прадстаўнікамі прыродазнаўчых факультэтаў. Пасля рэцэнзавання праектаў і разгляду кампетэнтнай экспертнай камісіяй да фінансавання прадстаўлены 21 праект. Камісія прымала да ўвагі навуковую і практычную вартасць прапанаванай праектнай работы, наяўнасць навуковых публікацый і склад творчага калектыву. Аднымі з лепшых у конкурсе грантаў на 2000 год былі прызнаны праекты:

"Распрацоўка і даследаванне ўстойлівых метадаў прагназавання часавых радоў" (ФПМІ, кіраўнік — аспірант Д.У. Зяневіч, куратар — доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Ю.С. Харын);

"Даследаванне фізіка-хімічных і транспартных уласцівасцей новых цвёрдых электралітаў і змешаных праваднікоў на падставе галатата лантана" (хімфак, кіраўнік — аспірант А.У. Кавалеўскі, куратар — доктар хімічных навук прафесар А.А. Вечар);

"Нейрасецявыя мадэлі і алгарытмы аналізу характарыстык паўправадніковых прыбораў" (ФРФіЭ, кіраўнік — аспірант А.К. Барановіч, куратар — старшы выкладчык У.М. Лутчкоўскі).

Магістрантаў і аспірантаў, чакаем на конкурсе грантаў 2001 года. Удзельнічайце і перамагайце!

*Упраўленне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, аддзел НДРСА.*

# ЗНАК ПРЫЗНАННЯ І ПАВАГІ



*Як вядома, падчас афіцыйнага візіту ў нашу краіну Беларускі дзяржаўны універсітэт наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Казахстан Нурсултан Абішавіч Назарбаеў.*

Завітаў ён сюды з нагоды ўручэння яму дыплома ганаровага доктара БДУ. Як сказана ў дыпломе, Назарбаеў адзначаны гэтым званнем "за вялікі ўклад у развіццё эканамічнай навукі і ўмацаванне дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі Казахстана і Беларусі". У якасці ганаровага доктара ён выступіў перад членамі Вучонага савета. Нурсултан Абішавіч расказаў пра сённяшнія рэаліі Казахстана, пра рэформы ў эканоміцы, адукацыі, сацыяльнай сферы. Асобна спыніўся ён на перспектывах развіцця двухбаковых адносін паміж нашымі краінамі. Не засталіся ў баку і агульныя праблемы СНД.

Прапануем тыя моманты з выступлення Н. Назарбаева, якія датычацца праблем адукацыі. Думаем, што фактычная інфармацыя і асабістыя думкі Прэзідэнта Казахстана будуць цікавымі для нашых чытачоў.

· Мы ў Казахстане імкнемся, згодна з патрабаваннямі сённяшняга жыцця, рэфарміраваць сваю сістэму адукацыі.

· Па закону, сярэдняя адукацыя поўнасцю на дзяржаўным забеспячэнні. А гэта: 9 базавых класаў і 2 класы, якія разам з адукацыяй даюць спецыяльнасць.

· Існуе праграма, выкананне якой мы ў наступным годзе заканчваем, поўнай камп'ютэрызацыі школ, якіх у нас 8,5 тысяч. Прычым пачыналі мы з вясковых школ. Мяркую, што на будучае гэтыя затраты апраўданыя.

· Колькасць студэнтаў за апошнія гады значна павялічылася. Зараз прыватных вну ў Казахстане намнога болей, чым дзяржаўных. Я мяркую, што з тых 50 дзяржаўных вучэбных навучальных устаноў, якія ёсць, мы ў хуткім часе пакінем толькі 8 — 9 базавых. Гэта могуць быць дзяржаўны універсітэт, вядучыя установы ў галінах эканомікі і фінансаў, сельскай гаспадаркі, медыцыны, культуры... Астатнія павінны стаць прыватнымі. У нас ёсць заказ. Мы падлічылі, што сёлета нам трэба 18 — 20 тыс. спецыялістаў. У конкурсе на гэтыя вакансіі ўдзельнічаюць як дзяржаўныя, так і прыватныя ўстановы.

· Вну павінны ісці ў нагу з рыначнымі рэаліямі, вучыцца зарабляць самі і вучыць гэтаму студэнтаў. Вышэйшая школа павінна не толькі даваць веды, але і вучыць эфектыўна іх прымяняць на практыцы.

· Два гады мы праводзім прыём студэнтаў у вну праз камп'ютэрнае тэсціраванне. Усім даем роўныя магчымасці.

· Наша Акадэмія навук — гэта прыкладна 50 акадэмікаў і 30 членаў-карэспандэнтаў. Мы ім ўстанавілі пажыццёвыя ганарары. Але вучоныя людзі павінны сваім выкладаннем перад студэнтамі даказваць сваю вучонасць і веды.

· 10 чэрвеня адбудзецца адкрыццё новага корпуса Еўразійскага універсітэта імя Гумілёва. Нядаўна з прэзідэнтам Літвы мы заходзілі на гэта будаўніцтва. Ён сказаў, што калі б яму за свой тэрмін прэзідэнцтва ўдалося пабудаваць хоць трэцюю частку такога будынка, ён быў бы шчаслівы. Сапраўды, гэта прыгожы будынак на 3 тысячы студэнтаў з вялікімі аўдыторыямі на 500 чалавек.

Я прапанаваў рэктару БДУ арганізаваць супрацоўніцтва двух універсітэтаў. Калі мы яго арганізуем, наладзім абмен студэнтамі, мы закладзем добры падмурак дружбы будучых пакаленняў.

## Ад чыгуншчыка да акадэміка

### Нурсултан Абішавіч Назарбаеў

Нарадзіўся 6 ліпеня 1940 года ў вёсцы Чэмалган Алма-Ацінскай вобласці. Працоўную дзейнасць пачынаў у горадзе Цеміртаў. Пасля заканчэння тэхнічнага вучылішча працаваў на Карагандзінскім металургічным камбінаце. У 1967 годзе атрымаў спецыяльнасць інжынера-металурга.

З 1969 года — на камсамольскай і партыйнай працы. У 1984 годзе ўзначаліў Савет Міністраў Казахскай ССР. З 1989 года — першы сакратар ЦК Кампартыі Казахстана, Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі.

У красавіку 1990 года Нурсултан Назарбаеў быў абраны Прэзідэнтам Казахскай ССР, а пасля ўсенародных выбараў 1 снежня 1991 года стаў Прэзідэнтам Рэспублікі Казахстан. Рэферэндум 1995 года прадоўжыў яго паўнамоцтвы да снежня 2000 года, але ў студзені 1999 года ён на альтэрнатыўнай аснове атрымаў перамогу на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан.

Н.А. Назарбаеў — доктар эканамічных навук, акадэмік Міжнароднай інжынернай акадэміі, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Казахстана, акадэмік сацыяльных навук Ра-сійскай Федэрацыі, замежны член Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, ганаровы прафесар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Ламаносава, ганаровы доктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Ён з'яўляецца старшынёй Асамблеі народаў Казахстана, Сусветнай асацыяцыі казахаў, ганаровым старшынёй Фонду дружбы Цэнтральна-азіяцкіх дзяржаў.

Н.Ф. Назарбаеў — аўтар шэрагу навуковых работ па праблемах эканомікі і сацыяльнага развіцця, кніг па грамадска-палітычнай тэматыцы. Сярод апошніх: "Стратэгія развіцця Казахстана як суверэннай дзяржавы", "Стратэгія рэсурсазберажэння і пераход к рынку", "Рынак і сацыяльна-эканамічнае развіццё", "На парозе XXI века".

Нурсултан Назарбаеў жанаты. Жонка Сара Алпысаўна па адукацыі інжынер-эканаміст, узначальвае дзіцячы дабрачынны фонд "Бабек". У сям'і тры дачкі.

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА.

## У БДУ прыехаў... шпіталь

*Днямі адбылася перадача Беларускаму універсітэту гуманітарнага груза.*

Канвой з чатырох машын прыйшоў да нас з Германіі. У межах дзяржаўнай праграмы, кантэйнеры фарміравала арганізацыя "Дапамога бальніцам Усходняй і Цэнтральнай Еўропы". Для арганізацыі універсітэцкага шпіталя прывезена базавага абсталявання прыблізна на 13 мільёнаў нямецкіх марак. Гэта — хірургічныя прылады, рэнтгенаўскія, дыягнастычныя ўстаноўкі, медыцынскія матэрыялы, лекі і нават "хуткая дапамога".

А нарадзілася ідэя такой гуманітарнай дапамогі ў чэрвені мінулага года, калі рэктар БДУ Аляксандр Казулін падчас візіту ў Германію, у горадзе Унна (Зямля Паўднёвы Рэйн — Вестфалія) сустрэўся з кіраўніком арганізацыі "Дапамога бальніцам Усходняй і Цэнтральнай Еўропы" доктарам Ролендам Лянгнерам .

Дзякуючы дзейнасці гэтай арганізацыі, якая пачалася ў 1991 годзе, гуманітарныя грузы атрымалі многія краіны: Боснія, Румынія, Расія... У нашу краіну таксама паступала падобная дапамога, напрыклад, у бальніцу горада Вілейкі.

# УСЕ — ГАНАРОВЫЯ

*На дыпломе ганаровага доктара Беларускага дзяржыўнага універсітэта, які днямі быў уручаны Прэзідэнту Рэспублікі Казахстан Нурсултану Назарбаеву стаіць нумар 15. Хто ж яшчэ і калі трапіў у каманду паважаных дактароў?*

| | | |
|---|---|---|
| 18.05.1992 | Эдмунд Ленгфельдэр (ФРГ), медык | За вялікія заслугі ў галіне радыёбіялогіі і аказанне дапамогі Беларусі ў работах па даследаванню вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС |
| 22.02.1993 | Аляксандр Баршчэўскі (Рэспубліка Польшча), прафесар, доктар філалагічных навук | За выдатныя дасягненні ў даследаваннях і пашырэнні навуковых ведаў пра Беларусь і беларускую літаратуру |
| 27.05.1993 | Анджэй Цеханавецкі (Англія), доктар мастацтвазнаўства | За выдатныя дасягненні ў даследаваннях і пашырэнні навуковых ведаў пра Беларусь і беларускае мастацтва |
| 30.06.1993 | Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, патрыяршы Экзарх Усея Беларусі | За вялікія асабістыя заслугі ў справе адраджэння духоўнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь |
| 30.05.1994 | Вольфганг Фехнер (ФРГ), прафесар, доктар эканамічных навук | За вялікія асабістыя заслугі ў развіцці навукі і адукацыі, пашырэнні сувязяў паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Вышэйшай школай Вюрцбург-Швайнфурт-Ашафэнбург, за безупынную працу па арганізацыі дапамогі Рэспубліцы Беларусь у ліквідацыі вынікаў Чарнобыльскай катастрофы |
| 30.01.1995 | Віктар Садоўнічы, рэктар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Ламаносава, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук, прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук | За выдатныя дасягненні ў матэматыцы і вялікі ўклад у падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі для Рэспублікі Беларусь |
| 5.06.1995 | Іван Чыгрынаў, народны пісьменнік Рэспублікі Беларусь | За выдатныя дасягненні ў літаратуры і асабістыя заслугі ў справе развіцця беларускай культуры |
| 18.12.1995 | Бернард Рысбург (Французская Рэспубліка), прафесар, доктар медыцынскіх навук | За вялікія заслугі ў навуковай і педагагічнай дзейнасці, асабісты ўклад у развіццё міжнароднага супрацоўніцтва Белдзяржуніверсітэта з вучэбнымі і даследчымі ўстановамі Францыі |
| 11.03.1996 | Віктар Скапенка, рэктар Кіеўскага універсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, акадэмік Акадэміі навук Украіны, прафесар, доктар хімічных навук | За вялікія дасягненні ў навукова-педагагічнай дзейнасці і ўмацаванне супрацоўніцтва паміж Кіеўскім універсітэтам імя Тараса Шаўчэнкі і Беларускім дзяржаўным універсітэтам |
| 29.04.1996 | Рыгор Барадулін, народны паэт Беларусі | За вялікія дасягненні ў беларускай паэзіі і айчыннай філалогіі |
| 27.05.1996 | Валянцін Шукшуноў, прэзідэнт Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы, доктар тэхнічных навук, прафесар | За вялікі ўклад у развіццё навукі ў вышэйшых навучальных установах, стварэнне ў іх асноў інавацыйнай дзейнасці і ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва універсітэтаў |
| 29.04.1996 | Вацлаў Жыдліцкі, прафесар Карлава універсітэта ў Празе, славіст, перакладчык | За плённую шматгадовую дзейнасць па даследаванні беларускай літаратуры, выдатныя пераклады твораў беларускіх пісьменнікаў на чэшскую мову, актыўнае ўмацаванне чэшска-беларускіх сувязяў, прапаганду беларускага пісьменства |
| 2.02.1998 | Дамаскін (Папандрэу), Высокапраасвяшчэннейшы Мітрапаліт Швейцарскі, Экзарх Усея Еўропы | За выдатныя дасягненні ў багаслоўскіх навуках, умацаванне міжцаркоўных адносін і міратворчае служэнне |
| 1.03.1999 | Рамазан Абдулатыпаў, Міністр нацыянальнай палітыкі Расійскай Федэрацыі, прафесар, доктар філасофскіх навук | За вялікі ўклад у развіццё тэорыі нацыянальных адносін і ўмацаванне дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі Расіі і Беларусі |
| 22.05.2000 | Нурсултан Назарбаеў, Прэзідэнт Рэспублікі Казахстан, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Казахстана, доктар эканамічных навук | За вялікі ўклад у развіццё эканамічнай навукі і ўмацаванне дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі Казахстана і Беларусі |

ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

## Школа актыву

*Прайшлі заняткі ў школе студэнцкага актыву.*

Яна была арганізавана Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы БДУ сумесна з Упраўленнем выхаваўчай працы з моладдзю.

Слухачы (а гэта актывісты Студэнцкага саюза Белдзяржуніверсітэта, камітэтаў БСМ, БПСМ, прафкама студэнтаў, органаў самакіравання інтэрнатаў, саветаў стараст факультэтаў) пазнаёміліся з праблемамі рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Белдзяржуніверсітэце, атрымалі вялікі аб'ём інфармацыі па пытаннях арганізацыі выхаваўчай працы ў інтэрнатах, развіцця сацыяльнай актыўнасці, прававога выхавання студэнцкай моладзі, вырашэння канфліктных сітуацый, практычнай псіхалогіі.

Адкрылі школу загадчык кафедры ўпраўлення вышэйшай школы, доктар фізіка-матэматычных навук І.І. Ганчаронак і начальнік Упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю, кандыдат гістарычных навук А.Б. Баргановіч. З кожным годам расце колькасць жадаючых тут вучыцца. Школа дае добрую магчымасць пазнаёміцца адзін з адным, абмяняцца вопытам.

Для чытання лекцый былі запрошаны супрацоўнікі і выкладчыкі БДУ, Міністэрства адукацыі і Дзяржкамітэта па справах моладзі. Былі арганізаваны "круглыя сталы" на тэмы "Перспектыўнае планаванне і аналіз работы маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў" і "Развіццё студэнцкага самакіравання на факультэтах".

*Вадзім ГПІН, сакратар Камітэта БСМ.*

## Выбірай, студэнт!

*Перавыбары ў склад студэнцкіх саветаў праходзяць традыцыйна кожны год.*

Сёлета, кіруючыся Палажэннем аб студэнцкім савеце інтэрната БДУ і ўлічваючы ўказанні Міністэрства адукацыі аб паляпшэнні выхаваўчай работы сярод студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах, прапанавана наступная структура органа студэнцкага самакіравання: старшыня, яго намеснік, сакратар, жыллёва-бытавая, культурна-масавая, спартыўная камісіі, інфармацыйны сектар, камандзір аператыўнага атрада інтэрната. Для больш аб'ектыўнага разгляду персанальных спраў па парушэннях правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах БДУ прапанавана ўвесці ў склад студсавета дадатковую камісію па папярэдняму разгляду і падрыхтоўцы праекта рашэння па персанальных справах. Усе члены студсавета — студэнты, якія жывуць у адпаведных інтэрнатах.

На працягу месяца ў інтэрнатах праходзіла бурная выбарчая кампанія: выбіралі дэлегатаў, кандыдатаў... У сёмым інтэрнаце, напрыклад, выбары прайшлі "без пылу і шуму", у "дзесятцы" — не без спрэчак за крэсла старшыні. У інтэрнаце ж № 4 канферэнцыя зацягнулася амаль да дзвюх гадзін ночы.

Дырэкцыя студгарадка, па словах намесніка дырэктара, задаволена вынікамі праведзенай выбарчай кампаніі. Работа пачалася ў запланаваным накірунку. Засмуціла студэнцкі гарадок толькі тое, што прадстаўнікі дэканатаў некаторых факультэтаў не патурбаваліся знайсці час для падрыхтоўкі выбараў у інтэрнатах.

*Алена ХРЫТАНЬКОВА.*

# "ПУШКІНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА"

*У студзені 1998 года інстытут "Адкрытае грамадства" распачаў адзін з самых беспрэцэдэнтных па маштабах і культурным значэнні дабрачынных праектаў – "Пушкінская бібліятэка".*

Асноўная мэта гэтага мегапраекта — забяспечыць бібліятэкі Расіі, СНД, Усходняй Еўропы лепшымі даведачна-энцыклапедычнымі выданнямі, кнігамі па гуманітарна-сацыяльнай праблематыцы, выданнямі мастацкай літаратуры.

Мегапраект разлічаны на тры гады. Дабрачынная дапамога інстытута "Адкрытае гармадства" заключаецца ў тым, што ён аплачвае 75% кошту затрат на набыццё літаратуры ў першы год, 50% — у другі і 25% — у трэці.

Ад Беларусі ў гэтым праекце прынялі ўдзел 60 бібліятэк. Каардынатарам мегапраекта ў нашай рэспубліцы выступіла Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук.

Фундаментальная бібліятэка БДУ, разумеючы ўсю выгоду такога праекта, таксама прыняла ў ім удзел. Супрацоўнікамі аддзела камплектавання і каталагізацыі фондаў быў старанна прапрацаваны "Каталог выданняў мегапраекта", у якім былі прадстаўлены 1000 назваў кніг, якія выдадзены 195 расійскімі выдавецтвамі. На аснове гэтага каталога быў складзены і адпраўлены ў Маскву адзіны заказ.

Усю далейшую працу па пытаннях фінансавых разлікаў з выдавецтвамі і дастаўкай заказа на літаратуру ўзяла на сябе Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Доўгі працэс перамоў, які вяла буйнейшая бібліятэка Беларусі з расійскім аддзяленнем фонду Сораса, расцягнуўся амаль на два гады.

З-за цяжкага фінансавага становішча нашых бібліятэк не ўсім з 60-ці, якія ўдзельнічаюць у праекце, удалося аплаціць заказаную літаратуру. Фундаментальнай бібліятэцы БДУ пашчасціла: у канцы 1999 года яе заказ быў аплочаны. У сувязі з гэтым хочацца выказаць вялікую падзяку рэктару Аляксандру Уладзіслававічу Казуліну, прарэктару па вучэбнай і інфармацыйна-аналітычнай рабоце Аляксандру Мікалаевічу Курбацкаму, начальніку ўпраўлення бухгалтарскага ўліку і фінансаў Валянціне Пятроўне Саладусе, дзякуючы якім фонд Фундаментальнай бібліятэкі папоўніўся новымі сучаснымі выданнямі.

Ужо ў пачатку 2000 года Фундаментальная бібліятэка пачала ўлік і навуковую апрацоўку літаратуры, атрыманай па мегапраекце "Пушкінская бібліятэка". Гэта 450 назваў і 750 экзэмпляраў навуковай і даведачнай літаратуры, выдадзенай у 1997—1999 гадах па гісторыі, філасофіі, экалогіі, паліталогіі, сацыялогіі, праву, псіхалогіі, культуралогіі, краіназнаўстве, мовазнаўстве і літаратуразнаўстве. Шырока прадстаўлены лепшыя кнігі такіх вядучых выдавецтваў Расіі, як "Росспэн", "Большая российская энциклопедия", "Дело", "Инфо-М", "Юнити", "Русский язык", "Международные отношения", "Современник".

Усе кнігі, атрыманыя па праекце, прайшлі выдавецкі конкурс. Сярод крытэрыяў, па якіх адбіраліся кнігі, дастаткова высокія патрабаванні былі да паліграфічнага выканання выданняў. Якасны змест прадстаўленых у мегапраекце кніг ацэньвала экспертная камісія ў складзе 10 чалавек: 5 экспертаў-спецыялістаў у галіне юрыспрудэнцыі, эканомікі і філалогіі і 5 бібліятэчных экспертаў з розных рэгіёнаў Расіі.

У якасці прыкладаў кніг, прайшоўшых экспертызу, можна назваць такія выданні, як "Рускае замежжа. Залатая кніга эміграцыі: Першая трэць XX стагоддзя: Энцыклапедычны біяграфічны слоўнік", "Энцыклапедыя геаграфічных адкрыццяў", "Поўны збор рускіх летапісаў" (у 2 т.), "Сусветная гісторыя войнаў" (у 3 кн.), "Анталогія сусветнай палітычнай думкі" (у 5 т.), "Рускі біяграфічны слоўнік", "Культуралогія. XX стагоддзе. Энцыклапедыя" (у 2 т.), "Тлумачальны эканамічны і фінансавы слоўнік. Французская, руская, іспанская, англійская, нямецкая тэрміналогія", "Расійская сацыялагічная энцыклапедыя", "Рэлігіі чалавецтва".

Запрашаем у Фундаментальную бібліятэку ўсіх жадаючых дакрануцца да сур'ёзнай навуковай літаратуры.

*А. БУЦІНА,*
*вучоны сакратар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.*



# Дэніэл Спекхард зайздросціць маладым беларусам

*На аддзяленні міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін адбылася сустрэча студэнтаў з паслом Злучаных Штатаў Амерыкі ў Рэспубліцы Беларусь спадаром Дэніэлам Спекхардам.*

Сустрэча, на якой таксама прысутнічаў прафесарска-выкладчыцкі састаў факультэта і студэнты іншых аддзяленняў, праходзіла ў вельмі цёплай атмасферы. Нават "колкія" пытанні студэнтаў — па канфлікту ў Косаве, напрыклад — успрымаліся паслом добразычліва, аб чым ён спецыяльна адзначыў напрыканцы.

Знешняя палітыка ЗША ў 90-я гады перажыла некаторую трансфармацыю, таму што павінна была ўлічваць складаныя змяненні, якія адбываюцца ў многіх дзяржавах свету. З улікам гэтага, ЗША і сканцэнтравалі намаганні на гарантаванне бяспекі міжнароднага супрацоўніцтва, падтрымцы дэмакратыі, эканамічнага супрацоўніцтва і вырашэння міжнацыянальных канфліктаў. Па словах пасла, працэсы, якія працякаюць зараз у Расіі, Беларусі, іншых краінах СНД, не засталіся ў ЗША без увагі. Як адзначыў спадар Спекхард, яго краіна імкнецца, каб на постсавецкай прасторы паспяхова развівалася эканоміка, што з'яўляецца асновай для развіцця міждзяржаўных сувязей.

У сваім выступленні пасол асабліва падкрэсліў, што ён па-добраму зайздросціць маладым людзям у зале, таму што яны жывуць у вельмі цікавы час — Беларусь набывае новае аблічча, ёсць умовы актыўна праявіць свае веды і талент у перабудаванні грамадства.

Напрыканцы пасол адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама падараваў факультэту падборку кніг сучаснай літаратуры.

Размовай студэнтаў аддзялення міжнароднага турызму з паслом ЗША завяршыўся цыкл сустрэч гэтага навучальнага года, якія былі арганізаваны кафедрай міжнароднага турызму. У ходзе цыкла студэнты сустрэліся з паслом Турцыі спадарыняй Шуле Сойсал, паслом Чэхіі спадаром Алешам Фойцікам, паслом Кіпра спадаром Гунасам Панаёцісам, міністрам спорту і турызму Яўгенам Мікалаевічам Варсіным, кіраўніцтвам Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Як адзначыў загадчык кафедры дацэнт Леанід Гайдукевіч, такі падыход у арганізацыі вучэбнага працэсу захаваецца і ў наступным годзе.

# Урокі Германіі для Беларусі

У пасляваенныя гады Германія апынулася ў складаным палітыка-эканамічным становішчы. Тады знайшоўся чалавек, які выратаваў краіну, здолеў неверагодна хутка вывесці яе з палітычнай ізаляцыі і падняць эканоміку. Гэта быў Конрад Адэнаўэр.

Менавіта дзейнасці першага пасляваеннага канцлера ФРГ Конрада Адэнаўэра і яго персаналіі было прысвечана першае пасяджэнне Клуба нямецкай культуры і навукі, адкрыццё якога адбылося нядаўна ў БДУ. Падзею ўшанавалі сваёй прысутнасцю Надзвычайны і Паўнамоцны пасол ФРГ у Рэспубліцы Беларусь спадарыня Вінкельман, намеснік старшыні ландтага зямлі Шлезвіг-Гальштэйн спадарыня Кётчаў, а таксама прадстаўнік фонду Конрада Адэнаўэра ў Санкт-Пецярбургу спадарыня Марліс Салазар.

Размова ў клубе магла б зацікавіць не толькі гісторыкаў. Напрыклад, адна з тэм дакладаў гучала наступным чынам: "Конрад Адэнаўэр і яго ідэі міжнароднай інтэграцыі. Вопыт і ўрокі для сучаснай Беларусі".

Арганізатар семінара начальнік Упраўлення міжнародных сувязей БДУ Аляксандр Мікалаевіч Рухля запрасіў усіх аматараў нямецкай гісторыі абавязкова завітаць на чарговы семінар і паабяцаў, што ў наступны раз госці сустрэчы будуць весці свабодную размову ў нефармальнай абстаноўцы за круглым сталом.

*Валерыя ЛУЦКОВА.*

# ЗЯМЛЮ Я ЗАЎСЁДЫ ЎСПРЫМАЮ З ДУШОЮ

*Сустрэчы з пісьменнікамі, паэтамі сталі добрай традыцыяй у Фундаментальнай бібліятэцы БДУ.*

У прыгожы вясенні дзень на літаратурную сустрэчу са студэнтамі БДУ быў запрошаны вядомы беларускі пісьменнік Вячаслаў Адамчык.

Сама прырода спрыяла гэтай сустрэчы з празаікам, які так тонка адчувае багацце і прыгажосць нашай Зямлі, роднага краю!

"...Ветрык падсушвае зямлю. Ты ступаеш на яе асцярожна, каб не зрабіць балюча. Зямлю я заўсёды ўспрымаю як нешта жывое, нават з душою.

... Светла і сонечна. Неба высокае, урачыстае, як бывае яно ранняю вясною і ранняю восенню...

Сарамліва, прытоена цвіце драбнюткі жоўты падбел...

Над пахучым жоўта-зялёным вербалозам пушыстым роем гудуць яшчэ нядужыя пасля зімы пчолы.

А наўкруг ужо карагоды беланогіх садоў. Гонкія ўшчэпкі чакаюць беларужовых кветак, як дзяўчаты вяселля...".



*Аўтограф на памяць.*

Так прыгожа апісвае вясну, красавік, Вячаслаў Адамчык на старонках сваіх дзённікаў.

Але, каб поўнасцю адчуць сакавітасць, яркасць, вобразнасць, непаўторнасць мастацкага слова пісьменніка, трэба чытаць яго творы. Тут і замілаванне родным краем, і душа беларускага народа, і вялікая праўда яго жыцця. Да сустрэчы з Майстрам слова была падрыхтавана выстава яго кніг.

У цэнтры выставы — тэтралогія, якая пачынаецца раманам "Чужая бацькаўшчына", зборнікі прозы "Свой чалавек", "Млечны шлях", "Міг бліскавіцы", "Дзікі голуб", "Дзень ранняй восені", "Раяль з адламаным вечкам". Былі прадстаўлены новыя кнігі: фантастычна-рэалістычная аповесць "Падарожжа на Буцафале", "Развітальная аповесць", новыя публікацыі ў часопісах...

Творы Вячаслава Адамчыка далучаюць чытачоў да лепшых набыткаў нацыянальнай літаратуры. Яны атрымалі літаратурнае і грамадскае прызнанне. Вячаславу Уладзіміравічу па праву прысвоена званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа.

Які празорлівы быў аўтар, калі казаў: "Шчаслівы буду, калі на ніве беларускай літаратуры ўзыдзе і маё зярнятка".

Прысутныя з вялікім задавальненнем слухалі госця, Творцу, чые творы народжаны роднаю зямлёю, напоены яе глыбіннымі сокамі, насычаны яе пахамі і фарбамі.

Вячаслаў Адамчык успомніў пра сваё "журботна-сумнае" дзяцінства, нялёгкія юнацкія гады; расказаў аб тым, як прыйшоў у літаратуру, адказаў на шматлікія пытанні прысутных, падпісаў многім удзельнікам сустрэчы свае кнігі.

*Людміла ЯНКОВІЧ,*
*Тамара ПАРКОВА.*
*Аддзел бібліятэчнай рэкламы ФБ БДУ*

# Як на Юр'я на геафаку...

Юр'я (Юрай ці Ягорый) — старажытнае свята беларусаў у гонар заступніка жывёлы і гаспадаркі Юрыя (Георгія), які ў часы хрысціянства прыйшоў на змену язычніцкаму славянскаму бажаству вясенняй урадлівасці і плоднасці жанчын — Ярылу. Колькі прымавак і прыказак падаравала гэтае свята! Як на Юр'я пагода, то на грэчку няўрода. Як на Юр'я ідзе дождж густы і вялікі, то будзе расці высокае жыта. Дождж на Юр'я — будзе хлеб і ў дурня. Юр'я на парог — вясну прывалок.

Раніцай сяляне ўрачыста выганялі статкі ў поле на цудадзейную "Юр'еву расу". Напярэдадні выводзілі на першы начлег коней. На свята абыходзілі з караваем палеткі. Адзначалі Юр'я і пастухі, якія наладжвалі на пашы абрадавы пачастунак.

Сёлета сіламі першакурснікаў і іншых студэнтаў геафака, якія неабыякава ставяцца да народнай спадчыны, пад кіраўніцтвам выкладчыцы Людмілы Уладзіміраўны Хрышчановіч і ў нас святкавалі Юр'я. Праводзілася яно ў выглядзе вуснага часопіса.

На першай старонцы прэзентавалася раніца ў хаце гаспадара Івана. Гледачы даведаліся пра ранішнія абрады, якія спраўляліся сялянамі на Юр'я. Дзякуючы выдатнай гульні актораў, усе знаходзіліся ў сапраўды святочнай атмасферы.

Не менш цікавай была і другая старонка "Пастухі ў полі". Яе ўдзельнікі прадэманстравалі не толькі акцёрскія здольнасці, але і добрае веданне звычаяў.

Песня пра басоту, некалі перафразаваная студэнцтвам, стала пралогам да наступнай, трэцяй старонкі "Раніца ў інтэрнаце". Гэта была самая студэнцкая старонка часопіса, але і тут гледачы даведаліся, напрыклад, што нельга пазычаць соль на Юр'я і пасмяяліся над добрай пародыяй на кіраўнікоў і выкладчыкаў.

Працягвала свята госця — паэтка Галіна Каржанеўская. Яна з'яўляецца яркім прадстаўніком лірычнай жаночай паэзіі. Акрамя гэтага, Галіна Анатольеўна вядомая як літаратуразнавец і крытык. Яна прачытала свае вершы, якія прыйшліся даспадобы гледачам, а таксама расказала пра цікавыя выпадкі са свайго жыцця.

Пятая старонка называлася "Юр'еўская бяседа". Былі тут і хаджэнне па зале з караваем, і віктарына з прызамі.

Цікавымі былі гульні "спрытная парачка", "вербачка"... А "полька" ў выкананні студэнтаў і выкладчыкаў стала кульмінацыяй вечара. Зала аддзячыла ўсіх удзельнікаў шчырымі апладысментамі.

"Мы цікавыя да той пары, пакуль ведаем сваё, беларускае!"—такімі словамі завяршыў сваю прамову намеснік дэкана па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.В. Кухарчык.

Паэтка Галіна Каржанеўская шчыра дадала: "Я вельмі ўражана. Мне вельмі спадабалася. Такія вёдовішчы вельмі радуюць і ўзбагачаюць чалавека".

Расказ пра Юр'я на геафаку хацелася б закончыць падзякай Людміле Уладзіміраўне Хрышчановіч, намаганнямі якой мы сталі сведкамі многіх добрых і пазнавальных відовішч.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*адказны за інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака.*

## ПАДПІСКА — 2000

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2000 года. Падпісная цана для індывідуальнай падпіскі на часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта» па серыях такая:

Серыя I **(Індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№3, верасень) — 630 рублёў;**

Серыя II **(Індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№3, кастрычнік) — 630 рублёў.**

Серыя III **(Індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, эканоміка, права (№2, ліпень; №3, лістапад) — 1261 рубель;**

Серыя IV **(Індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№2, жнівень; №3, снежань) — 1261 рубель.**

Часопіс распаўсюджваецца па падпісцы і ў розначны продаж не паступае.

**Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса.**


## САЮЗ ЖАНЧЫН БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс** на лепшы сцэнарый па святкаванні "Дня маці", якое пройдзе 14 кастрычніка 2000 года.

**Апошні тэрмін падачы** — 15 жніўня. Лепшы сцэнарый будзе адзначаны прэміяй.

**Інфармацыю прадстаўляць па тэлефонах 226-58-98, 268-70-05.**



## Навукова-даследчая установа "Інстытут ядзерных праблем" Беларускага дзяржаўнага універсітэта

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

Загадчыка аддзела фізікі высокіх энергій;

Старшых навуковых супрацоўнікаў (2 чалавекі) і навуковых супрацоўнікаў (2 чалавекі) лабараторыі ядзернай спектраметрыі;

Старшых навуковых супрацоўнікаў (3 чалавекі), навуковых супрацоўнікаў (2 чалавекі), малодшых навуковых супрацоўнікаў (2 чалавекі) лабараторыі эксперыментальнай фізікі высокіх энергій.

**Тэрмін конкурсу** — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

*Адрас: 220050, г. Мінск, НДІ ЯП, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.*

# ФУТБОЛЬНЫЯ БАТАЛІІ

*Падыходзіць да заканчэння чарговая спартакіяда сярод факультэтаў БДУ. І, як заўсёды, адзін з апошніх відаў, які стаіць у праграме, — футбол.*

Яшчэ з восені, пасля першынства універсітэта па футболе сярод першых курсаў, футбалісты мацнейшых факультэцкіх каманд прыкідваюць моц сапернікаў на вясну і, ледзь перазімаваўшы, ужо з сакавіка пачынаюць чысціць буцы і прымярацца да маладзенькай траўкі.

І ў гэтым годзе футбольнае свята атрымалася цікавым. Інтрыга закруцілася, што трэба. Ды і сенсацый хапала...

Што датычыцца формы правядзення чэмпіянату, то арганізатары вырашылі не вынаходзіць веласіпед і не адказаліся ад мінулагодняй. Усе факультэты былі падзелены на дзве лігі. Каманды вышэйшай лігі спрачаліся за залатыя медалі, а першай — за права ў наступным годзе гуляць супраць мацнейшых зборных універсітэта.

У апошнія гады нават пасля заканчэння некалькіх тураў нельга сказаць, хто на гэты раз будзе ўладальнікам залатых медалёў. Многія каманды на першым этапе спаборніцтваў лідзіруюць за кошт удалых гульняў з сераднячкамі. Але калі чарга даходзіць да юрыстаў і географаў, то адразу ўсё становіцца на свае месцы. І вельмі часта толькі ў сустрэчы паміж сабою гэтыя элітныя футбольныя факультэты разыгрывалі "золата". Але на гэты раз супрацьстаянне юрыстаў і географаў не атрымалася. У географаў увесь час штосьці не атрымлівалася, а юрысты, як і заўсёды, выглядалі добра адладжанай машынай.

Сярод юрфакаўцаў нельга каго-небудзь выдзеліць асобна. Гэта каманда так і засталася камандай калектыўнай гульні. З сямі гульняў у яе толькі адна нічыя і ніводнага паражэння. Вынік — варты чэмпіёна.

На другім месцы — радыёфізікі. Гэта зборная ніколі нічым асаблівым не вызначалася. Роўны падбор гракоў. Няма тут вялікіх "зорак", але няма і правалаў у лініях. Гуляць супраць такой каманды вельмі цяжка. Яны заўсёды гулялі ў сваю гульню. Стане восем чалавек у абарону — і рабі з імі, што хочаш. А пасля хапае адной-другой дакладнай перадачы дыспетчара Уладзіміра Калкоўскага на шустрага нападаючага Уладзіслава Цігіна — і гульня зроблена.

Нечакана для ўсіх трэцяе месца занялі журналісты. І зноў, як і на працягу некалькіх гадоў, яны сталі адным з галоўных дзеючых асоб і парушальнікамі спакою ў вышэйшай лізе. Некалькі сезонаў запар журналістам, каб трапіць у чацвёрку лепшых, патрэбна была толькі перамога ў апошняй гульні. Але, выйграючы пэўны адрэзак матчу, журфак увесь час заканчваў гульню ў нічыю. На гэты раз усё скончылася без трагедый. Дарэчы, пасля першых чатырох гульняў гэта была адзіная каманда, якая не страціла ніводнага ачка. Механіка-матэматычны факультэт, факультэт прыкладной матэматыкі, філолагі і гісторыкі не змаглі стрымаць націск журналістаў. Амаль захаваўшы свой мінулагодні склад, зборная ўзмацнілася некалькімі цікавымі першакурснікамі і пазбавілася ад сваёй адвечнай хваробы: губляць ачкі ў гульнях з не зусім моцнымі сапернікамі. Аднак нічыя 1:1 з радыёфізікамі і два паражэнні ад юрыстаў (0:2) і географаў (1:2) каштавалі журфакаўцам дорага.

А вось географаў нават перамога над журналістамі не выратавала. Бо паражэнні ад юрыстаў (0:3), радыёфізікаў (1:2) і нават гісторыкаў (0:3) не далі ім падняцца вышэй чацвёртага месца. А калі ўлічыць, што каманда і ад філолагаў ледзь вынесла ногі (4:3), то будучыня зборнай выглядае вельмі туманна.

Мехмат, мехмат... Ужо некалькі год запар скадваецца так, што каманда выдатна праводзіць гульню супраць лідэраў юрыстаў (у гэтым чэмпіянаце лік быў 2:2), а пасля... Яна паціху апускаецца ў сярэдзіну турнірнай табліцы. Гэткі моцны сярэднячок, які ўсіх прымушае лічыцца з сабой.

ФПМ — навічок вышэйшай лігі. Перамогі над філолагамі і гісторыкамі і нічыя з мехматам — нядрэнны пачатак. А калі ўлічыць, што тры з чатырох прайграных матчаў скончыліся з мінімальным лікам 0:1, то гэтую каманду ні ў якім разе нельга скідваць з рахунку ў наступным першынстве.

Ну што сказаць пра каманды гістарычнага і філалагічнага факультэтаў... Гісторыкам трэба ставіць помнік толькі за разгром геафака. А філолагам скалаціць выдатную футбольную каманду на факультэце, дзе большасць складаюць дзяўчаты, пакуль немагчыма.

# СВЯТА Ў ВОЛЬНЫМ СТЫЛІ

*Трэці год запар наш універсітэт праводзіць фестывалі здароўя сярод студэнтаў, якія займаюцца ў падрыхтоўчых і спецыяльных групах па фізічнай культуры. Усё, што адбываецца на спартыўных арэнах, праходзіць па прынцыпе "не нашкодзь здароўю".*

Два гады таму назад усё пачыналася з фестывалю аэробікі. Маленькая зала. Некалькі каманд-удзельніц. У мінулым годзе мерапрыемства праходзіла з большым размахам. Адбывалася яно ў баскетбольнай зале спорткомплекса БДУ і акрамя чэмпіянату універсітэта правадзіўся і чэмпіянат горада. Усе жадаючыя маглі пазаймацца аэробікай пад наглядам майстраў экстра-класа.

У гэтым годзе арганізатары фестывалю зрабілі яшчэ адзін крок наперад. Каб павялічыць колькасць гледачоў, фестываль пераехаў у актавую залу галоўнага корпуса БДУ. Аэробіка стала толькі першым турам ва універсітэцкай спартакіядзе сярод студэнтаў з адхіленнем ў стане здароўя.



Сёлета спонсарамі фестывалю аэробікі выступалі "Саюз жанчын БДУ", прафкам студэнтаў, фітнес-клуб "Эдэм", "Альфа-радыё" (прэзідэнт Святлана Камінская), Беларуская асацыяцыя "Спорт і мастацтва" (прэзідэнт Леанід Дварэцкі.

Дзесьці за гадзіну да спаборніцтваў пачалі збірацца гледачы. Набралася поўная зала.

На першынстве універсітэта, як і год таму, вызначылася Вікторыя Назарчук з геафака. Дзяўчына ўразіла ўсіх сваёй натхнёнасцю і эмацыянальнасцю. Але прыгажуні з юрфака, бездакорна выканаўшы сваю праграму, пакінулі географам толькі другое месца. Філфаку дасталося трэцяе месца.

А сярод вну горада лепшымі сталі дзяўчаты з Медыцынскага інстытута.

Другім этапам спартакіяды стала плаванне. У госці да нашага універсітэта завіталі медыкі і каманда з тэхналагічнага універсітэта.

Абсалютным чэмпіёнам БДУ стаў студэнт ФЭФа Аляксандр Зайцаў. Ён жа быў другім на дыстанцыі 50 метраў вольным стылем. Другія месцы займалі Аляксей Огнеў (50 метраў брасам), Максім Агеенка (50 метраў на спіне), Дар'я Лагунец (25 метраў на спіне) і Таццяна Гурыновіч (25 метраў вольным стылем).

*Вольга КУЛІКОВА.*

# СТУДЭНЦКАЯ ПСІХАЛОГІЯ

*Аксана Уладзіміраўна Шапашнікава скончыла аддзяленне псіхалогіі БДУ, зараз вучыцца ў аспірантуры, адначасова працуе педагогам-псіхолагам у студэнцкім інтэрнаце №10.*



**— Раскажыце, калі ласка, пра тыя праблемы, з якімі да Вас прыходзяць студэнты. Мабыць, усе яны звязаны з вучобай?**

— Як раз наадварот. Атрымліваецца, што праблем з вучобай у студэнтаў няшмат. У асноўным іх турбуюць праблемы асабістага характару, зносін з равеснікамі, праблемы самапазнання. Звяртаюцца і з любоўнымі трагедыямі.

**— Наколькі папулярная ваша служба?**

— Нягледзячы на тое, што кабінет псіхолага працуе толькі з красавіка гэтага года, да нас звяртаецца шмат студэнтаў. Прычым дзяўчат і хлопцаў прыблізна пароўну.

**— Аксана Уладзіміраўна, ці можна за адзін сеанс вырашыць усе праблемы?**

— Калі праблема складаная, аднаразовага наведвання недастаткова. Часам я даю парады пасля мяне наведаць і іншых спецыялістаў — нарколага, псіхіятра... Але часцей за ўсё "прагаворванне" сітуацыі з псіхолагам дапамагае чалавеку ацаніць яе з іншага боку і прыйсці да высновы, што праблема не такая сур'ёзная, як здаецца на першы погляд, што яна не вартая тых пакут, што перанесены. Увогуле няма чалавека без праблем. У жыцці могуць наступіць такія моманты, калі ён па розных прычынах не можа з імі справіцца сам. Менавіта ў такую хвіліну патрэбна дапамога спецыяліста, задача якога зразумець ступень цяжкасці праблемы, падказаць шляхі яе вырашэння, дапамагчы чалавеку паверыць у тое, што ён можа вырашыць яе.

**— Кліент уваходзіць у кабінет. Вы з першага погляду можаце ацаніць яго стан?**

— Псіхалогія вывучае розныя аспекты чалавечага жыцця і самога чалавека ў прыватнасці. Ёсць пэўныя прыкметы, па якіх можна меркаваць аб яго эмацыянальным стане, рысах характару, але адразу даць поўную характарыстыку асобы нельга. Патрэбны працяглыя і шчырыя зносіны.

**— А як жа тады розныя гадалкі, якія ў момант могуць расказаць пра наш лёс амаль усё?**

— Гадалкі абапіраюцца на агульныя факты, яны даюць сярэднестатыстычныя даныя, характэрныя для большасці людзей. Хачу дадаць, што навуковая, эксперыментальная псіхалогія не даказала існавання якіх-небудзь здольнасцей у гадалак, медыумаў, але і не адмаўляе іх.

**—Хачу папрасіць практычнай парады: як перанесці стрэс падчас сесіі?**

— Універсальных парад няма. Але скажу, што часам стрэс нават неабходны, у невялікай дозе, канечне. Неабходны, каб мабілізавацца, сканцэнтравацца. Але, калі яго ступень настолькі высокая, што перашкаджае падрыхтоўцы да экзаменаў, тады не лішнім будзе звярнуцца да псіхолага.

**— Так што ж, да пабачэння?**

— Заходзьце, калі ласка.

*Гутарыла Вольга БЕЛАШ.*

# Свята прыгажосці моды і стылю

*Яно адбылося ва універсітэце 18 і 19 мая.*

У першы дзень у конкурсе "Залатая пралеска" дэманстравалі сваё майстэрства цырульнікі і стылісты. Назіральнікі азнаёміліся з тэндэнцыямі развіцця моды ў гэтым сезоне, а таксама аддалі даніну арыгінальным, авангардным і непаўторным прычоскам і візажу.

У другі дзень выбіралі самую прывабную і абаяльную дзяўчыну пад шоу-конкурсу " Міс БДУ — 2000", які праходзіць раз у два гады. Многія дзяўчаты жадалі б мець такі тытул, але каб яго атрымаць, трэба быць не толькі прыгожай, але мець моцны характар, смеласць і вялікае жаданне быць першай. Удзельніцы праходзілі два адборачных туры, а потым два месяцы рыхтаваліся да галоўнай падзеі.

Ацэньвала выступленні аўтарытэтнае журы, у якім былі такія вядомыя ў шоу-бізнесе людзі, як Саша Варламаў, Алена Спірыдовіч, Іна Афанасьева.



Конкурс складаўся з чатырох тураў. У першым трэба было цікава і арыгінальна расказаць пра сябе. У другім — ўдзельніцы прадэманстравалі свае магчымасці трымацца на подыуме ў вопратцы ад фірмы "Мастра". Паміж турамі выступалі спевакі, танцавальныя групы.

На трэцім этапе дзяўчаты выходзілі на сцэну ў купальніках фірмы "Мілавіца".

У апошнім туры, які праходзіў пад назвай "Дзяўчына ў белым", удзельніцы выйшлі ў туалетах нявест. Гэта, па-мойму, быў самы прыгожы момант.

А пасля выбіралі "Міс Фота", "Міс сімпатый гледачоў", "Другая віцэ-міс", "Першая віцэ-міс", было некалькі спецыяльных прызоў ад спонсараў. А самай прыгожай назвалі Маю Дзвірскую, студэнтку 4 курса філалагічнага факультэта. Усіх зачаравала яе абаяльная ўсмешка.

Яна вельмі стамілася ад конкурсу, але згадзілася адказаць на некалькі кароткіх пытанняў.

**— Майя, якія адносіны ўсталяваліся сярод удзельніц?**

— Проста цудоўныя. Мы ўсе сталі сяброўкамі і вырашылі сустракацца пасля конкурсу.

**— Як адчуваеце сябе ў якасці самай прыгожай дзяўчыны БДУ?**

— Пакуль не вызначылася, але ж вельмі рада, што стала першай.

**— Ці было прадчуванне, што менавіта вас назавуць "Міс БДУ — 2000"?**

— Спачатку не, але к апошняму туру з'явіліся азарт і вялікі настрой на перамогу.

*Ксенія МАСАЛЁВА.*

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*30 мая*
*Зак. 400у*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 206-61-43.*

**Рэдактар нумару І. ЧАРТКОЎ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

Камп'ютэрная вёрстка Юліі Бераснёвай